# Мерапрыемства “Неба не дасць памерці…” да 80-годдзя з дня нараджэння Леаніда Дайнекі



2020-01-31

**29 студзеня 2020 года ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры прайшла імпрэза “Неба не дасць памерці…”, прымеркаваная да 80-годдзя з дня нараджэння пісьменніка Леаніда Дайнекі.**

У імпрэзе прынялі удзел галоўны рэдактар часопіса “Маладосць” **Святлана Воцінава**, пісьменнікі **Эдуард Акулін**, **Генрых Далідовіч, Сяргей Законнікаў, Кастусь Цвірка;** літаратуратуразнаўцы, кандыдат філалагічных навук **Анатоль Верабей** і **Таццяна Лаўрык;** вядомы даследчык знакавых дзеячаў беларускай культуры **Васіль Дранько-Майсюк,** краязнаўца і складальнік адметнай крыжаванкі па творчасці Леаніда Дайнекі **Лявон Целеш,** аўтары і выканаўцы песень **Таццяна Беланогая** і **Кастусь Герашчанка**, сваякі і нашчадкі пісьменніка, якія расказалі аб сваіх стасунках з Леанідам Дайнекам і ўзгадалі яркія ды запамінальныя эпізоды, звязаныя з гэтай асобай.








